Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Сярэдняя школа №2 г.Старыя Дарогі”

# ЛІТАРАТУРНЫ РЫНГ

**(інтэлектуальная гульны для вучняў Х-ХІ кл)**

Падрыхтавала і правяла
настаўніца беларускай мовы
і літаратуры
Патапеня Т.К.

2019/2020 навучальны год

# ЛІТАРАТУРНЫ РЫНГ

Мэта: *праз гульню праверыць веды вучняў па беларускай літаратуры; развіваць пазнавальную актыўнасць вучняў; спрыяць фарміраванню культуры зносін; выпрацоўваць здольнасць лагічна і хутка мысліць; выхоўваць у школьнікаў пачуццё любові і гонару за беларускую літаратуру і культуру.*

Абсталяванне: фотавыстава “Помнікі беларускім пісьменнікам”, стэнд “Літаратурны вернісаж” (малюнкі – ілюстрацыі вучняў да твораў, урыўкі з іх эсэ пра любімыя кнігі)

Эпіграф:

Нам кніга –вечнае святло,
Крыніца ведаў, цуд бясконцы!
*Міхась Пазнякоў.*

**Ход мерапрыемства:**
**І. Арганізацыйны момант.**
**ІІ. Матывацыйны момант.**

Уступнае слова настаўніка.

Навакольны свет вельмі багаты і разнастайны. Любы дапытлівы чалавек спрабуе даведацца аб ім як мага больш. Але колькі б чалавек не імкнуўся да пазнання таямніц прыроды, ўсё роўна застануцца пытанні, загадкі, якія яна заўсёды будзе гатова іх прадставіць.

Нішто так не палоніць людзей, як прыгажосць; нішто так не пераконвае, як праўда; і нішто так не ўздзейнічае, як прыклад. А дзе можна задаволіць сябе, дзе знайсці адказ на пытанне? Адказ просты: у кнізе.

А якая роля кнігі ў сучасным свеце? Роля кнігі па-ранейшаму велізарная! Кніга – крыніца маральных каштоўнасцяў. Чалавек, які чытае кнігу – пазнае шмат цікавага, папаўняе сваю памяць новымі словамі. Яна можа задаволіць інтарэсы чалавека, якія чалавек знаходзіць у кнізе. Можна сказаць так: "Скажы мне, што ты чытаеш, і я скажу хто ты". Камп’ютар і тэлевізар – ніколі не заменяць кнігі!

Сёння, дарагія сябры, мы паглыбімся ў свет кніг. *(Чытаем эпіграф)*

У гульні ўдзельнічаюць дзве каманды *(прадстаўляем каманды, называем капітанаў).*

***І тур.*** **Размінка**

Конкурс каманд: хто хутчэй дасць адказ на пытанне.

1. Як называецца твор, галоўны герой якога палясоўшчык Тарас? («*Тарас на Парнасе*»)
2. Хто аўтар паэмы «Энеіда навыварат»? *(Вікенцій Равінскі)*
3. Каму належаць словы: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!»? *(Ф.Багушэвіч)*
4. Імя героя паэмы Ф.Багушэвіча «Кепска будзе! » *(Аліндарка)*
5. Назва зборніка апавяданняў Яна Баршчэўскага*? (“Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”)*
6. Хто аўтар верша «Марыська чарнаброва, галубка мая…»? *(Кастусь Каліноўскі)*
7. Жанр камедыі В.Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта»*.(Фарс-вадэвіль)*
8. Сапраўднае прозвішча Якуба Колоса. *(Міцкевіч)*

9. У якім творы героі вельмі часта ужываюць словы «тудэма-сюдэма» і «вось-цо-да»? Хто яго аўтар? *(Янка Купала. Камедыя «Паўлінка»)*
10. Хто аўтар радкоў «Мой родны кут, як ты мне мілы!. »? *(Якуб Колас. «Новая зямля»)*
11. Які беларускі паэт памёр зусім маладым, ва ўзросце 25 гадоў? Выдаў толькі адзін прыжыццёвы зборнік, які выйшаў у 1913 годзе ў Вільні. Загадайце прозвішча паэта і назву зборніка. *(Максім Багдановч. Зборнік «Вянок")*
12. Назавіце вядомыя літаратурна-мастацкія арганізацыі 20-х гадоў ХХ стагоддзя. *(«Маладняк», «Узвышша», «Полымя»)*
13. Гарлахвацкі, Туляга, Чарнавус – героі камедыі…*(Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім»)*
14. Каму з герояў п'есы Кандрат Крапівы «Хто смяецца апошнім » аўтар дае такую характарыстыку : «ходзіць ён нячутна, нібы на лапках, знянацку паяўляецца там, дзе яго не чакаюць»? *(Зёлкіну)*
15. Назва знакамітага рамана з трылогіі І.Мележа пра Палессе.*(«Людзі на балоце»)*
16. Аўсееў, Карпенка...(Свіст, Пшанічны, Глечык, Фішар) – героі аповесці… *(Васіля Быкава «Жураўліны крык»)*
17. Назавіце герояў драмы А.Дударава «Вечар». *( Мульцік, Ганна, Гастрыт)*
18. Галоўны герой рамана У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», які жыў у сялянская сям'і Кагутоў. Ён разважае : «Бедныя, бедныя людзі! Як каласы, як трава пад сярпом тваім, грубая сіла! » *(Алесь Загорскі)*
19. Яраш, Шыковіч, Гукан – героі рамана… *(Івана Шамякіна «Сэрца на далоні»)*
20. Хто аўтар нарыса «Зямля пад белымі крыламі»? *( Уладзімір Караткевіч)*
21. Якое прозвішча Сцепаніды і Петрака,герояў аповесці В. Быкава « Знак бяды»? *(Багацькі)*

***II тур.*** **Беларускія асветнікі**

(Па 8 пытанняў кожнай камандзе.)

1. Вядучыя жанры літаратуры Сярэднявечча. *( Словы, казанні, хаджэнні, жыціі, малітвы)*
2. Назавіце сапраўднае (свецкае) імя Ефрасінні Полацкай. *(Прадслава)*
3. На якой мове было напісана «Жыцце Ефрасінні Полацкай»? *(На царкоўнаславянскай)*
4. Назавіце імя майстара, які паводле заказу Ефрасінні Полацкай зрабіў славуты крыж. *(Лазар Богша)*
5. Каго з беларускіх асветнікаў называлі Златавустам? *(Кірылу Тураўскага)*
6. Якім яшчэ словам называюць эпоху Адраджэння? *(Рэнесанс)*
7. Назавіце прадстаўнікоў эпохі Адраджэння. *( Ф.Скарына, М.Гусоўскі, С.Будны, В. Цяпінскі)*
8. На якой мове ўпершыню была напісана паэма М.Гусоўскага «Песня пра зубра»? *(На лацінскай)*
9. У паэме «Песня пра зубра» М. Гусоўскі паказваў мужнага і сумленнага князя ВКЛ, які вёў незалежную палітыку. Хто ён? *(Ватаўт)*
10. Як звалі бацьку Ф.Скарыны і чым ён займаўся? *(Лука, купец)*
11. Дзе былі выдадзены першыя кнігі Ф.Скарыны? *( У Празе)*
12. Біблія у перакладзе с грэчаскай мовы азначае… *(Кніга)*
13. Партрэт якога беларускага асветніка знаходзіцца ў Падуанскім універсітэце ў «Зале сарака»? *( Партрэт Ф.Скарыны)*

14. Хто выдаў у Нясвіжы ў 1562 годзе «Катэхізіс»? *( Сымон Будны)*
15. Хто з дзеячаў беларускай культуры 17 стагоддзя вучыў і выхоўваў Пятра I? *( Сімяон Полацкі)*

***III тур*. Свет нашых продкаў**

*(*Па 15 пытанняў кожнай камандзе.)

1. У час якіх свят моладзь варажыла? *( На Каляды, « Стары» Новы год)*
2. Калі адзначалася свята Каляды? *(25 снежня ў католікаў, 7 студзеня – у праваслаўных)*
3. Якая вада лічылася ў народзе святой, гаючай ад розных хвароб чалавека і жывёлы, захоўвалася ў кожнай хаце за абразамі? Калі яна набіралася ў посуд? *( На Водахрышчы, 19 студзеня)*
4. Каля адзначалі другі Спас, або «Яблычны»? *( 19 жніўня.)*
5. На якое свята людзі цалуюць адзін аднаго тройчы? *( На Вялікдзень)*
6. Калі ў дзень гэтага свята здарыцца навальніца і каго-небудзь заб’е маланка, тлумачаць, што чалавек пакараны за вялікія грахі перад Богам. У гэты дзень забараняецца купацца. *(Ілья)*
7. Якое праваслаўнае свята адзначаюць двойчы на год – вясной і зімой? *( 22 мая – вясновы Мікола, 19 снежня – зімовы Мікола)*
8. Пра гэты месяц казалі, што ён «зямлю грэе, а сіверам вее »; «калі ён халодны – год будзе галодны”. (Май)
9. У гэты дзень «дзеўка касу не пляце, птушка гнязда не ўе, курыца не нясе». *(Дабравешчанне, або Дабравесце, Звеставанне, Благавешчанне)*
10. У час якога сямейнага абраду нельгя выходзіць першым з-за стала маладому чалавеку? Першым павінен з хаты выйсці старэйшы. *( У час памінак)*
11. Дзяўчата ў гэтую летнюю ноч варажылі, напрыклад, на трыпутніку: ліст клалі пад падушку, каб прысніўся любы. *( з 6 на 7 ліпеня)*
12. У час якога сямейнага абраду «вазілі» бабу і кумоў на баране? *(Хрэсьбіны)*
13. Пра які святочны дзень у народзе кажуць: « да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а к вечару скачуць»? *(Радаўніца)*
14. Калі адзначаецца Радаўніца? *( У аўторак праз тыдзень пасля Пасхі, або Вялікадня.)*
15. У канцы лета адзначалася самае значнае свята і асвячаўся хлеб? *( Прачыстая, 28 жніўня.)*
16. Ёю нашы продкі засцілалі ложак, вешалі на сцяну для ўпрыгажэння пакою. *(Посцілка.)*
17. Дзіцячы ложак. (Калыска.)
18. Гаспадарчая пабудова для захавання сены, саломы. *( Пуня, адрына.)*
19. Хатні ткацкі станок. ( *Кросны.)*
20. Майстар, які вырабляў посуд, ёмістасці з дрэва. *(Бондар.)*
21. Шлях, дарога, пракладзеная ў нізкім, балоцістым месцы. *( Грэбля.)*
22. Ёмістасць для заквашвання цеста. *(Дзяжа.)*
23. Пасудзіна для збівання масла. *(Маслабойка.)*
24. Даўні звычай вясковых дзяўчат і жанчын збірацца восеньскімі і зімовымі вечарамі за працай у адной хаце. *( Вячоркі.)*
25. Ручныя вагі. *( Бязмен.)*

26. Прыстасаванне для разгладжвання, качання бялізны. *( Качалка.)*
27. Пабудова для памолу зерня. *(Млын.)*
28. Скрына, у якой хавалі тканіну, адзенне, бялізну. *(Куфар.)*
29. Ноч з моцнымі грымотамі, маланкамі, страшэнным ветрам і праліўным дажджом, якая беларусамі чакалася ў канцы лета. *(Вераб'іная ноч.)*
30. Невялікае паселішча ад аднаго да пяці двароў. У такім паселішцы нарадзіўся Янка Купала. *( Фальварак.)*

***IV тур.*** **Чорная скрыня**

Якая рэч ляжыць у гэтай скрыні? Пазнайце па апісанню.

1. У адной з беларускіх народных казак герой увесь час нешта шукае. Да каго ён толькі не звяртаўся: і да барана, і да гусей, і да каня. Што шукаў герой казкі і што ляжыць у чорнай скрынцы? *(Акраец хлеба з казкі «Лёгкі хлеб»)*
2. Герой вядомай аповесці В.Быкава быў вельмі сквапны. Ён не захацеў дзяліцца са сваімі таварышамі-байцамі тым, што ляжыць у чорнай скрыні. Што гэта? *(Сала. Пшанічны. «Жураўліны крык»)*
3. У аповесці З.Бядулі «На Каляды к сыну» Тэкля пайшла ў горад, каб наведаць свайго адзінага сына Лаўручка. Успомніце, як сустрэў яе сын. Што таркнуў ёй лёкай у скручаныя ад холаду пальцы? *(Некалькі трохрублёвак)*
4. Успомніце раман І.Мележа «Людзі на балоце». Перад вяселлем Ганна паехала на кірмаш. Параска купіла ў бацькі Ганны бульбы і папрасіла завезці яе на кватэру. Калі бульбу прывезлі да дома, Параска падала Ганне штосьці загорнутае ў газету:
   «Гэта вам ад мяне. К вяселлю…Нічога другога няма.»
   Што падарыла Параска Ганне? *(Кнігу)*
5. Успомніце апавяданне В.Карамазава "Дзяльба кабанчыка». Эпізод, калі дзеці ад'язджалі ў горад. Што ўспомніла Ганна перадаць унуку Андрэю?
   *(Семачкі, гарбузікі)*

***V тур.*** **Сем падказак**

Размова пойдзе пра вядомых дзеячаў беларускай літаратуры і культуры. Вам даецца 7 падказак. Хто адгадае з першай падказкі, атрымае 7 балаў, з другой –6 балаў і г.д.

**Першая асоба**

1. Славуты беларускі паэт.
2. Яго бацька быў вядомым фалькларыстам і этнографам.
3. Большую частку жыцця ён пражыў не ў Беларусі, але самастойна вывучаў беларускую мову і пісаў на ёй вершы.
4. У раннім дзяцінстве ён жыў у Гародні.
5. Пісаў вершы класічных формаў, чым узняў беларускую літаратуру на сусветны ўзровень.
6. Памёр на 26-м годзе жыцця.
7. Аўтар зборніка «Вянок». *(М.Багдановіч)*

**Другая асоба**

1. Жыў у XII стагоддзі.
2. Сын вельмі багатых бацькоў.
3. Быў манахам і займаўся літаратурнай дзейнасцю.
4. Праведнае жыццё зрабіла яго настолькі паважаным, што людзі прасілі яго стаць епіскапам.
5. Быў цудоўным прамоўцам.
6. Нашы продкі называлі яго Златавустам.
7. Нарадзіўся ў Тураве.

   *(Кірыла Тураўскі.)*

**Трэцяя асоба**

1. Полацкая князёўна надзвычнай прыгажосці.
2. Яе бацька − першы вядомы нам полацкі князь.
3. У канцы жыцця пайшла ў манастыр.
4. Яе другое імя Гарыслава.
5. Князь Уладзімір змусіў яе выйсці за сябе замуж пасля таго, як захапіў Полацк і забіў яе бацькоў і братоў.
6. Праз яе сына Ізяслава была адноўлена дынастыя полацкіх князёў.
7. Яе праўнук – Усяслаў Чарадзей.

*(Рагнеда.)*

**Чацвёртая асоба**

1. Полацкая князёўна.
2. Унучка Усяслава Чарадзея.
3. У 12 гадоў пастрыглася ў манашкі.
4. Настаўніца, асветніца, перапісчыца.
5. Мецэнатка, пабудавала Спаскі сабор.
6. Адна з першых жанчын на ўсходнеславянскіх землях, якая была абвешчана святой.
7. Нябесная заступніца Беларусі.

   *(Ефрасіння Полацкая.)*

**VI тур. Аўтар – твор.**

Па ўрыўках з твораў наўавіце аўтара і яго твор.

1. Строга й сурова караў звычкі дурныя людзей.
   Ён справядлівасць любіў, шанаваў яе нормы святыя, не дазваляў, каб махляр дзесць абходзіў закон.

   *(Князь Вітаўт; М.Гусоўскі. «Песня пра зубра».)*

2. Бегла поле і другое,
   Узбегла і на трэцяе,
   Ды ўжо сілы не хапае
   Далей так ляцелі.

   *(Я. Купала. «Бандароўна».)*

3. Ад родных ніў, ад роднай хаты
   У панскі двор дзеля красы
   Яны, бяздольныя, узяты
   Ткаць залатыя паясы.

(*М.Багдановіч. «Слуцкія ткачыхі».)*

4. Пасля таго праз паўгоду
   У марцы ж мяне на свабоду,
   Дзякуй богу, адпусцілі
   У той дзень, як і хрысцілі.

*(Ф.Багушевіч. «Кепска будзе!».)*

5. Дзіўная дзяўчына! Не магу апомніцца ад здзіўлення з самога сябе! Мімаволі закахаўся ў нейкую сялянку… я, каторы дагэтуль лічыў іх за быдла, цёмнае, нічым не ўлагоджанае! О цудна! Што ж бы на гэта сказалі парыжскія прыгажуні?

*(В.Дунін-Марцінкевіч.«Ідылія».)*

6. Другі баран – ні «бэ» ні «мя», а любіць гучнае імя.

*(Крандат Крапіва.)*

7. Смешна было глядзець, як маці бярэ з агульнай кучы кавалак, варочае яго з боку на бок, перакладае з рукі на руку, гадаючы каму пакласці, а сёстры і Коля ўважліва сочаць ўа матчынымі рукамі, маўчаць, ані слова.

*(В.Карамазаў.«Дзяльба кабанчыка».)*

8. Голас ў яе быў свежы , малады, сакавіты. Спявала яна з такім праўдзівым пачуццём, што рабіла вельмі добрае і прыемнае ўражанне. Нейкі жаль ахоплівaў, слухаючы гэтыя напевы, хацелася падысці да дзяўнчыны і запытаць яе: «Скажыце, якое гора ў вас на сэрцы?»

*(Васіль Беражны.«Матчын голас».)*

9. Зневажаў, катаваў ён з дружынай сваёй;
   Стражы князевы - ў полі і дома,
   Толькі модлы раслі небу ў сэрцах людзей,
   І пракляцце расло пакрыема.

*(Янка Купала. «Курган».)*

10. У дзяцінстве хлопчык любіў бавіць час у свайго дзядзькі, які жыў на самым беразе возера. Зімой, калі лютавала завіруха і збіваліся са шляху падарожныя, дзядзька заўсёды выстаўляў на акне свечку. Агеньчык прываблівaў сялян, шляхту, купцоў. Яны расказвалі аб розных дзівах дзівосных, сапраўдных здарэннях і выдуманых.

*(Ян Баршэўскі. «Шляхціц Завальня».)*

11. Трэба пачынаць новае жыццё. І я яго пачну. Яшчэ мы знойдзем зямлі ў сваей старане і яшчэ мы хату адбудуем на сваім загоне! Я добра прыглядзеўся, як людзі жывуць, і добра надумаўся, як трэба жыць. Тата праўду сказаў, што трэба розумам ваяваць, а не тапаром.

*(Янка Купала.«Раскіднае гняздо».)*

12. Цяпер жа я табе напішу навуковую працу! Насмяяўся ты з мяне, абняславіў перад людзьмі, пасмяюся ж і я з цябе. Якую ж яму выдумаць дапатопную жывёліну, каб падобна была на яго?

(*Кандрат Крапіва. «Хто смяецца апошнім».)*

13. Каханенькая, родненькая, не думай, што я якую дрэнь выбраў сабе на зяця. Заўтра ён прыедзе, паглядзіш, дык адразу што другое запяеш. Адным словам, хлапец: шляхоцкага заводу, з рызыкай, з усякай далікатнасцяй і ўсё такое...

*(Янка Купала.«Паўлінка».)*

14. Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае,
Чым так прыкованы я?...

*(Якуб Колас. «Родныя вобразы».)*

15. Гэта быў звычайны чыгуначны пераезд, якіх нямала параскідана на сталёвых шляхах зямлі. Захінуўшыся ад ветру каўнярамі зашмальцаваных, аблепленых глінай шынялёў, шасцёра іх стаяла купкай ля зламанага дышля шлагбаума. Тулячыся адзін да аднаго, яны маркотна пазіралі ў восеньскую далеч і слухалі камбата.

*(В.Быкаў. «Жураўліны крык».)*

16. У вёсцы той, дзе жыў ён змалку,
Дзе пасціў, дзе араў, касіў,
На воку дзеўку меў, Натальку,
Аб ёй адной ён толькі сніў.

*(Янка Купала.«Магіла льва».)*

17. Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем…

(*Р.Барадулін.«Трэба дома бываць часцей»)*

Жудасны чалавек сядзеў перад Горавым. Страшны, як шалёная рысь. І Гораў няшчыра пазяхнуў і спытаў:

- Вы французскай хваробай ніколі не хварэлі, капітан? Бо нешта мне здаецца, што такія словы сведчаць аб размякчэнні спіннога мозгу.

*(У.Караткевіч.« Паром на бурнай рацэ».)*

18. - А што вочы такія ў цябе - дак мне ето, папраўдзе, даспадобы! Такіх ні ў кога няма болей. І сам ты - харошы, толькі што маўклівы, унурысты. Усё адно як грэбуеш дзеўкамі ці баішся!

*(І.Мележ.«Людзі на балоце».)*

19. Вароны, магчыма, памяталі нешта, а можа, сваім птушыным інстынктам адчувалі ў гэтым знявечаным дрэве злую прыкмету няшчасця, знак даўняй бяды.

*(В.Быкаў. «Знак бяды».)*

**VII тур. Веру – не веру Конкурс капітанаў**

1. У «Жыціі» гаворыцца пра Ф.Скарыну: «…як промень сонечны, які прасвятліў зямлю Полацкую»? *(не веру)*
2. Сапраўднае прозвішча Максіма Танка Яўген Іванавіч Скурко. *(веру)*
3. Геракл, герой грэчаскай міфалогіі, здзейсніў 14 подзвігаў. *(не веру)*
4. Аўтар пенталогіі «Трывожнае шчасце»І.Мележ. *(не веру)*
5. Унучку Усяслава Чарадзея звалі Прадслава. *(веру)*
6. Е.Полацкая была паэткай. *(не веру)*
7. Крыж Е.Полацкай у даўжыню меў 151 см. (*не веру)*
8. Славутыя слуцкія паясы ткалі не дзявочыя, а дужыя мужчынскія рукі. *(веру*)
9. Аўтар паэмы «Люцыян Таполя» П.Панчанка. *(не веру)*
10. У жанравых адносінах твор І.Шамякіна «Гандлярка і паэт»—раман. *(не веру)*
11. Аўтар зборніка « «Жалейка» Я.Купала. *(веру)*
12. Пяру М.Гусоўскаму належыць 3 паэмы, больш 10 вершаў. *(веру)*
13. Раман, аповесць, апавяданне, навела, нарыс—эпічныя творы. *(веру*)
14. Аўтар апавядання «Дзяльба кабанчыка» Міхась Стральцоў. *(не веру)*
15. Цётка—аўтар паэмы «Магіла льва*” (не веру)*
16. Аўтар апавядання «Галя» І.Шамякін (*не веру)*
17. Зося Савіч—гераіня рамана І.Шамякіна «Сэрца на далоні» *(веру)*
18. Сапраўднае прозвішча К.Чорнага Раманоўскі. *(веру)*
19. Псеўданім, якім падпісваўся К.Каліноўскі, Мацей Бурачок. *(не веру)*
20. Люцыян Акаловіч—герой рамана У.Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім” (не веру)
21. Аўтар верша «Бывай…» А.Куляшоў. *(веру)*
22. Корчак, Кандрат Кагут—героі твора У.Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» *(не веру)*

**VIII тур. Супергульня**

Назавіце знакамітых і выдатных пісьменнікаў, якімі ганарыцца Беларусь.

1. Назавіце паэта Беларусі, акадэмік НАН Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі за кнігу «Нарачанскія сосны», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы, ганаровы грамадзянін Мінска. *(Максім Танк.)*
2. Народны пісьменнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР за аповесці «Абеліск» і «Дажыць да світання», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа за аповесць «Воўчая зграя» і «Яго батальён», Ленінская прэміяй быў адзначаны ў 1986 годзе. *(Васіль Быкаў.)*
3. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі СССР за спектакль «Радавыя», аўтар сцэнарыя кінастужкі «Белыя росы». *(Аляксей Дудараў.)*
4. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы за кнігу паэзіі «Вастрыё стралы», творы гэтага пісьменніка перакладзены больш як на 20 моў свету. Асобнымі выданнямі яго кнігі выйшлі ў Германіі, Польшчы, Балгарыі, іншых краінах, вядомы ў беларускай літаратуры як наватар, аўтар новых мастацкіх формаў.(*Алесь Разанаў.*)